# Аб тым, што мацнейшае за жыццё

**Летась у выдавецтве «Дзелавы друк» пабачыла свет перавыдадзеная, дапоўненая і дапрацаваная кніга Марыі Ляшук «Блаславёныя небам» пад назвай «Скрозь зімы ды вёсны».**

Навелы, што ўвайшлі ў кнігу, — тонкае павуцінне жаночых пачуццяў і лёсаў, у кожнай гісторыі — нешта трывожнае, глыбокае і трапяткое, «шалёная барацьба сэрца і розуму» — тое, што раніць і лечыць, што непадуладна часу і, нягледзячы ні на што, выратавальна свеціць маяком па жыцці.

Пад адной вокладкай зnative знітаваны шэсць тэматычных раздзелаў: «Рапсодыя кахання», «Прычал шчасця», «Сумаваць, жартуючы», «Настальгія», «Дзякуй Богу!» і невялікі паэтычны блок «Акорды сэрдца». У іх — «светлыя рамантычныя пачуцці» з «трывожнай вясновай пяшчотай» і «невытлумачальным сумам». Ёсць месца добрым дарожным гісторыям, настальгіі па басаногім дзяцінстве і яснавокім юнацтве, адкрыццям і цёплым прызнанням у любові і адданасці роднай старонцы — вёсцы Табулкі, роднай хаце, дзе «моцныя смалістыя сцены беражліва захоўваюць светлыя таямніцы», і самаму роднаму чалавеку — маці, святой памяццю аб якой святлее сэрца аўтара.

Філасофскія тэмы — святло і драма кахання, сіла веры, радасць жыцця і горыч смерці, каштоўнасць імгнення і бясконцасці — так цесна пераплецены ў творчасці Марыі Ляшук, што немагчыма ўявіць сабе яе прозу і паэзію іншымі, чым яны ёсць… І гэта ўшчыльную падводзіць чытача да пошуку ісцін і дапамагае цаніць, здавалася б, самыя простыя, звыклыя рэчы.

Большасць прадстаўленых у кнізе твораў заснаваны на рэальных падзеях, месцамі ўскладненых мастацкай выдумкай. Па словах аўтара, ёй неабыякавы кожны герой. Інтанацыя выдае ў аўтары глыбока далікатнага чалавека, а прысутнасць у творчасці Бога і Божага слова — глыбока верніка.

Марыя Іванаўна Ляшук — член Саюза пісьменнікаў Беларусі і член Саюза журналістаў Беларусі, лаўрэат прэміі Беларускага саюза жанчын за цыкл навел аб жаночых лёсах, лаўрэат конкурсу Беларускага саюза журналістаў «Залатое пяро», заслужаны работнік друку, выбітны палескі лірык, журналіст.

Кніга «Скрозь зімы ды вёсны» выйшла абмежаваным накладам у 200 экзэмпляраў. Спяшайцеся чытаць!

**Святлана ЛЁЛЯ**